УДК 81376:811.161.3

***А. М. Шубадзёрава***
*дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*
*Магілёўскага інстытута МУС,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

# ФОРМЫ І МЕТАДЫ РЭАЛІЗАЦЫІ ІНТЭГРАВАНАГА ПАДЫХОДУ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ДЫСЦЫПЛІНЫ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)»

# FORMS AND METHODS OF IMPLEMENTATION OF THE INTEGRATION APPROACH IN THE STUDY OF THE DISCIPLINE «BELARUSIAN LANGUAGE (PROFESSIONAL VOCABULARY)»

***Анатацыя.*** *У артыкуле разглядаецца такі важны і перспектыўны напрамак у адукацыі, як інтэграцыя, апісваюцца ўзроўні і формы інтэграванага навучання. Раскрываецца паняцце міжпрадметных сувязей як прынцыпу інтэграцыі, вызначаюцца асаблівасці выкарыстання міжпрадметнага матэрыялу пры вывучэнні дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)».*

***Ключавыя словы:*** *інтэграцыя, міжпрадметныя сувязі, узроўні і формы інтэграцыі, інтэграваная сітуацыя, інтэграваны ўрок, інтэграваны курс, інавацыйныя тэхналогіі, беларуская мова (прафесійная лексіка).*

***Annotation.*** *The article discusses such an important and promising direction in education as integration, describes the levels and forms of integrated education. The concept of interdisciplinary connections as a principle of integration is revealed, the features of the use of interdisciplinary material in the study of the discipline «Belarusian language (professional vocabulary)» are determined.*

***Keywords:*** *integration, interdisciplinary connections, levels and forms of integration, integrated situation, integrated lesson, integrated course, innovative technologies, Belarusian language (professional vocabulary).*

У сучаснай сістэме адукацыі інтэграцыя — адзін з найважнейшых і перспектыўных метадалагічных напрамкаў. У самым агульным разуменні працэс інтэграцыі — узаемапранікненне зместу розных дысцыплін, якія вывучаюцца ў той ці іншай навучальнай установе, для фарміравання комплексных ведаў пра розныя з’явы навакольнага свету. Працэс інтэграцыі ўяўляе сабой найвышэйшую форму ўвасаблення міжпрадметных

сувязей на якасна новай ступені навучання. Дапаўненне вучэбных дысцыплін разгалінаванай сістэмай міжпрадметных сувязей значна павышае эфектыўнасць адукацыйнага працэсу і актуалізуе праблему інтэграцыі ў педагогіцы.

Варта адзначыць, што ідэя міждысцыплінарнага ўзаемадзеяння ў працэсе навучання з’яўляецца далёка не новай і мае даўнія традыцыі. У класічных падручніках па педагогіцы надаецца нямала ўвагі разгляду дадзенай педагагічнай катэгорыі. Распрацоўкай тэорыі міжпрадметных сувязей займаліся многія педагогі, у прыватнасці К. Д. Ушынскі, М. Ф. Бунакоў, В. І. Вадавозаў, М. М. Скаткін, У. Я. Стаюнін і інш. Сёння інтэграваныя формы навучання актыўна выкарыстоўваюцца пры вывучэнні розных дысцыплін у многіх навучальных установах, пра што сведчаць навуковыя публікацыі В. А. Дзегцярова [1], Р. Б. Жандаўлетавай, А. Д. Ахмедавай [2], І. Я. Карышынай, А. І. Сухавеевай [3], Б. Х. Панеш, Л. Л. Бурковай [4] і інш.

Інтэграванае навучанне, на думку В. А. Дзегцярова, «абапіраецца на асацыятыўна-рэфлекторную канцэпцыю навучання, згодна з якой засваенне ведаў, фарміраванне навыкаў і ўменняў, развіццё асабістых якасцей чалавека ёсць працэс утварэння ў яго свядомасці разнастайных асацыяцый — простых і складаных, сярод якіх, па Ю. А. Самарыну, выдзелены і “міжсістэмныя” або “міжпрадметныя” асацыяцыі» [1, с. 25].

У педагагічных даследаваннях вылучаны тры ўзроўні інтэграцыі: 1) унутрыпрадметная — інтэграцыя паняццяў унутры асобных вучэбных прадметаў; 2) міжпрадметная — сінтэз фактаў, паняццяў, прынцыпаў дзвюх і больш дысцыплін, якія павінен выкарыстоўваць педагог пры падрыхтоўцы інтэграванага ўрока; 3) транспрадметная — сінтэз кампанентаў асноўнага і дадатковага зместу адукацыі.

У якасці асноўных інтэграваных форм навучання вылучаюць наступныя: 1) міжпрадметная сітуацыя; 2) інтэграваны ўрок; 3) інтэграваны курс.

Міжпрадметную сітуацыю можна разглядаць як элементарную форму інтэграцыі, у якой агульная для шэрагу дысцыплін праблема вырашаецца агульным для гэтых абласцей метадам.

Інтэграваны ўрок забяспечвае выяўленне і засваенне агульнай для дысцыплін тэмы, на прыкладзе якой можна паказаць метадалогію розных навук у падыходзе да гэтай праблематыкі.

Інтэграваны курс — гэта вучэбны курс, які аб’ядноўвае вывучэнне розных дысцыплін у адзін вучэбны прадмет.

У навукова-метадычнай літаратуры вылучаюць тры тыпы інтэграваных урокаў:

• Урок з выкарыстаннем міжпрадметных сувязей. Пры правядзенні такога тыпу заняткаў узнікае эпізадычны зварот да матэрыялу іншай дысцыпліны для ўзбагачэння ведаў навучэнцаў і пашырэння іх кругагляду па пытанні, якое разглядаецца.

• Урок міжпрадметнага характару. Аб'ект пазнання і спосаб дзейнасці папераменна раскрываюцца з пазіцый розных вучэбных дысцыплін. І майстэрства настаўніка заключаецца ў тым, каб як мага арганічней ажыццявіць гэты міждысцыплінарны падыход.

• Інтэграваны ўрок. Змест вучэбных дысцыплін адначасова аб'ядноўваецца і падаецца ў рамках урока. Тут назіраецца паралельнае «суіснаванне» матэрыялу двух або некалькіх вучэбных прадметаў.

Трэба адзначыць, што па спосабе арганізацыі інтэграцыя дапускае падрыхтоўку і правядзенне заняткаў двума і больш выкладчыкамі розных дысцыплін ці адным, які мае базавую падрыхтоўку па адпаведных дысцыплінах.

«Беларуская мова (прафесійная лексіка)» інтэгруецца з многімі дысцыплінамі, такімі як руская мова, беларуская літаратура, правазнаўства, справаводства, гісторыя, замежныя мовы, журналістыка і інш. Міжпрадметныя сувязі дазволяць пашырыць і ўзбагаціць прафесійны лексічны запас навучэнцаў, выпрацаваць уменне практычнага карыстання тэрміналогіяй і прафесійнай лексікай па абранай спецыяльнасці, а таксама больш дэталёва пазнаёміць з юрыдычнай дакументацыяй і асаблівасцямі яе афармлення.

Вельмі важная роля ў вывучэнні прафесійнай лексікі адводзіцца рабоце з тэкстам: пераклад тэксту з рускай мовы на беларускую і наадварот, пераказ тэксту, лінгвістычны аналіз тэксту і інш. Праз тэкст рэалізуюцца не толькі асноўныя мэты заняткаў (камунікацыйная, адукацыйная, выхаваўчая), але і ўстанаўліваюцца сувязі з іншымі дысцыплінамі, якія вывучаюць студэнты. Так, напрыклад, невялікі тэкст для перакладу пра абавязкі і правы службовых асоб дазволіць правесці паралелі з такой дысцыплінай, як «Адміністрацыйнае права», і пашырыць змест прапанаванага тэксту новай інфармацыяй (дадатковае паведамленне, відэафрагмент, статыстычныя даныя і інш.).

Міжпрадметныя сітуацыі могуць разглядацца пры вывучэнні амаль усіх праграмных тэм дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)». Так, вывучаючы тэму «Беларуская мова і яе месца ў сістэме агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей», неабходна прыгадаць гістарычныя факты і падзеі (дзяржаўны статус беларускай мовы ў ВКЛ,

паланізацыя і русіфікацыя, моўныя рэформы савецкага часу і інш.), якія паўплывалі на фарміраванне сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Знаёмства з тэмай «Лексічная сістэма беларускай мовы» зробіць актуальнымі звесткі з іншых замежных моў пра паходжанне запазычанай лексікі. Ахарактарызаваць функцыянальныя стылі маўлення (тэма «Функцыянальныя стылі маўлення») дапамогуць тэксты прафесійнага накірунку, з мастацкай літаратуры, са сродкаў масавай інфармацыі і інш. Разабрацца з відамі афіцыйна-справавых тэкстаў (заява, даверанасць, аўтабіяграфія, дакладная запіска, дзелавыя лісты), засвоіць правілы іх напісання і афармлення дапаможа такая дысцыпліна, як «Справаводства» (тэма «Афіцыйна-справавы стыль») і г. д.

Выкарыстанне інтэграваных форм навучання ў адукацыйным працэсе мае шэраг пераваг у параўнанні з традыцыйнымі формамі. Па-першае, яны (інтэграваныя формы) садзейнічаюць фарміраванню пазнавальнай цікавасці навучэнцаў, цэласнай навуковай карціны свету; па-другое, спрыяюць развіццю маўлення, вучаць параўноўваць, абагульняць, рабіць высновы, інтэнсіфікуюць вучэбна-выхаваўчы працэс; па-трэцяе, не толькі паглыбляюць уяўленне аб прадмеце, пашыраюць кругагляд, але і спрыяюць фарміраванню рознабакова развітай асобы.

Такім чынам, інтэграваныя формы навучання надаюць новую якасць працэсу адукацыі, забяспечваюць засваенне набытага вопыту, які выходзіць за межы праграмных ведаў, і абумоўліваюць больш высокі ўзровень кампетэнтнасці ў прафесійнай сферы, чым пры традыцыйным навучанні.

Вядома, інтэграцыя не з’яўляецца ўніверсальным сродкам у падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, але яе выкарыстанне дае магчымасць павысіць якасць прафесійнай падрыхтоўкі навучэнца.

**Спіс асноўных крыніц**

1. Дегтерев, В. А. Интеграция в подготовке специалистов социальной сферы в вузе / В. А. Дегтерев // Фундаментальные исследования. — 2012. — № 6-1. — С. 23–26.

2. Жандавлетова, Р. Б. Интегрированное обучение как один из способов повышения качества биологического образования учащихся / Р. Б. Жандавлетова, А. Д. Ахмедова // Евразийский союз ученых. — 2020. — № 5-8(74). — С. 11–14.

3. Каришина, И. Е. Интегрированное занятие как способ активации познавательной деятельности слушателей программ дополнительного профессионального образования / И. Е. Каришина, О. И. Суховеева // Азимут научных исследований: педагогика и психология. — 2016. — Т. 5, № 4 (17). — С. 421–424.

4. Панеш, Б. Х. Образовательная функция межпредметных связей / Б. Х. Панеш, Л. Л. Буркова // Problems of modern education : materials of the

IX international scientific conference, Prague, 10–11 Sept. 2018. — Prague : Vedecko vydavatelske centrum Sociosfera-CZ s.r.o., 2018. — C. 33–37.